**Г. А. АРЦЯМЁНАК,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
загадчык кафедры беларускага мовазнаўства
Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава;
**В. Л. ВАРАНОВІЧ,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларускай мовы
Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы;
**А. А. РАДЗЕВІЧ,**
старшы выкладчык кафедры сучаснай беларускай мовы
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;
**С. М. ЯКУБА,**
кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры сучаснай беларускай мовы
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

# РЭСПУБЛІКАНСКАЯ АЛІМПІЯДА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ: аналіз заданняў і парады

Вынікі XXIX Рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры вучняў устаноў агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі даюць падставы меркаваць пра дастаткова высокі ўзровень моўнай і маўленчай падрыхтоўкі ўдзельнікаў, іх нестандартнае мысленне, творчы патэнцыял, шырокі філалагічны кругагляд.

Тыя віды работ, што традыцыйна падаюцца як тры туры алімпіяды, на практыцы даказалі сваю мэтазгоднасць.

Водгук на мастацкі твор дазваляе раскрыць творчыя магчымасці вучняў, вызначыць, наколькі яны ўмеюць дакладна і вычарпальна абгрунтоўваць уласнае прачытанне твора, аналізаваць яго праз параўнанне з іншымі, вызначаючы кампазіцыйную будову, сюжэтныя лініі, вобразы, мастацкія сродкі выразнасці і інш.; наколькі сфарміравана ўменне карыстацца моўнымі сродкамі ў адпаведнасці са стылем і жанрам маўлення, засвоены арфаграфічныя, граматычныя і пунктуацыйныя нормы сучаснай беларускай мовы.

Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры дазваляе меркаваць пра ступень сфарміраванасці ведаў, уменняў і навыкаў па ўсіх раздзелах курса беларускай мовы і літаратуры, навуковы кругагляд і філалагічнае мысленне вучняў.

Што да вуснага выказвання, то яно вызначае ўзровень валодання вуснай формай маўлення: уменне ствараць паведамленне на прапанаваную тэму, для якога характэрнымі прыметамі з'яўляюцца творчы падыход да падачы матэрыялу і аргументацыі вывадаў, лагічнасць, чысціня, правільнасць, багацце, выразнасць і эфектыўнасць маўлення.

Але на гэтым алімпіяда не заканчваецца. Асаблівая форма работы з вучнем па падрыхтоўцы да яе патрабуе сістэмнасці, прадуманасці, скіраванасці, адпаведных методык, якія грунтуюцца не толькі на патэнцыяле ведаў. Спецыфіка амаль усіх конкурсаў вымагае і пэўнай псіхалагічнай адаптацыі, стварэння ўмоў, пры якіх вучань зможа максімальна раскрыць духоўны і творчы патэнцыял. Больш таго, знайсці ў сабе тое адметнае, чым кожны з нас цікавы для астатніх як асоба. Можна па-рознаму гэта кваліфікаваць: харызма, артыстызм, талент, дарунак звыш і г. д. — сутнасць застаецца нязменнай. Як паказвае практыка і гісторыя правядзення алімпіяды, менавіта такое спалучэнне методык падрыхтоўкі, максімальна пазбаўленае

прагматызму, дазваляе «выхаваць» пераможцаў духоўных, хто, незалежна ад выбару будучай прафесіі, жыве і ўключае іншых у прастору нацыянальнай беларускай культуры.

Прапануем своеасаблівы зрэз вынікаў, аналіз праходжання конкурсаў заключнага этапу XXIX рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура», падмацаваны парадамі нашых кампетэнтных членаў журы. Спадзяёмся, што гэта дапаможа і канкурсантам, і нашым шаноўным настаўнікам, хто і вядзе іх да перамогі.

## IX клас

### Комплексная работа

**З заданнем № 1** комплекснай работы па беларускай мове і літаратуры вучні дзявятых класаў справіліся з сярэдняй ступенню паспяховасці. Пра гэта яскрава сведчаць як сярэдні бал, атрыманы канкурсантамі за выкананне гэтага задання (3,5 з магчымых шасці), так і той факт, што не знайшлося ніводнай работы, выкананай бездакорна (увогуле, толькі ў адной рабоце заданне было выканана на 5 балаў — гэта значыць, з дванаццаці пар слоў было выбрана дзесяць правільных напісанняў), а найменш паспяховымі былі дзве работы, у якіх за першае заданне атрымана па два балы. Пры гэтым паказальна, што ніводзін з канкурсантаў не памыліўся ў выбары правільнага напісання *вэб-сайт*, тады як некаторыя рабілі няправільны выбар нават у першай і — часцей — у шостай парах (памылковыя напісанні *акардзеон* і *бюлецень*), дзе можна і трэба было абаперціся на добра вядомае правіла напісання *д*, *т* перад галоснымі ў словах іншамоўнага паходжання. Такія вынікі сведчаць пра тое, што школьнікамі лягчэй засвойваюцца найноўшыя запазычанні, у той час як напісанне даўно запазычаных слоў можа выклікаць праблемы. Праўда, у праекцыі на гэтае заданне пытанні, з якімі сутыкнуліся канкурсанты, справядліва будзе ацаніць як аб'ектыўныя, паколькі напісанне літар *е* або *э* ў словах іншамоўнага паходжання не пасля *д*, *т* не рэгламентавана правіламі, а вызначаецца толькі па слоўніках. Да таго ж у размеркаванні *е* і *э* па розных словах ці пазіцыях не прасочваецца якой-небудзь выразнай заканамернасці, а змены ў правапісе некаторых слоў гэтай групы адбыліся нават адносна нядаўна (у прыватнасці, слова *сэрвіс* у напісанні з *э* замест *е* ўпершыню пададзена ў 1993 г. у чацвёртым выданні акадэмічнага «Руска-беларускага слоўніка»). Улічваючы такі вось праблемны характар першага задання, яго можна ацаніць як вельмі абгрунтаванае, бо яно прымушала канкурсантаў адначасова, з аднаго боку, да ўсведамлення наяўнасці ў беларускай мове цэлага пласта запазычанняў, правапісная і арфаэпічная адаптацыя якіх не вызначаецца ўстойлівай паслядоўнасцю, а з другога — да выпрацоўкі ўласнага сістэматызаванага падыходу да размежавання блізкіх, але ўзаемавыключальных варыянтаў напісання слоў.

**Заданне № 2** скіравана на актывізацыю бачання міжмоўных сувязей, што датычацца ўзаемаадносін беларускай мовы з мовамі класічнымі. А дакладней, на ўменне распазнаваць у структуры беларускіх слоў карані шырокаўжывальных слоў лацінскай мовы. Такі навык можа быць карысным для старшакласнікаў у тым, што дазваляе адчуваць уключанасць беларускай мовы ў глабальную сістэму міжмоўных карэспандэнцый, паколькі класічныя мовы, і асабліва лацінская, паслужылі асновай або крыніцай фарміравання значных лексічных пластоў многіх еўрапейскіх моў. Разам з тым на фоне распазнаванай іншамоўнай лексікі, і на кантрасце з ёю, вучні могуць больш упэўнена пазнаваць спрадвечна славянскія і ўласна беларускія словы, што, несумненна, павінна спрыяць выпрацоўцы ў іх больш глыбокага адчування мовы, умення дыферэнцыраваць моўныя сродкі дзеля дасягнення аптымальнай формы ў стылістычных адносінах пры вусным і пісьмовым маўленні. Аналіз выканання другога задання паказаў, што вучні дзявятых класаў у цэлым добра арыентуюцца ў справе распазнавання лацінскіх каранёў у структуры беларускіх слоў: сярэдні бал склаў тут 4,67. Пры гэтым 26 % атрымалі максімальны бал — «шэсць». Ніжэйшым балам быў «тры», які атрымалі 15 % удзельнікаў. Найбольш распаўсюджаным недахопам (не лічачы адсутнасці адказаў у адносінах да паасобных лацінскіх слоў) было некрытычнае ўспрыманне суадносін паміж часткова сугучнымі і адначасова семантычна сумежнымі словамі. Яскравы прыклад — трактоўка як аднолькавых па паходжанні слоў *карона* і *кароль*. Таксама паказальнай памылкай, хоць і менш грубай, з'яўляецца меркаванне, што грэцызм

«цыліндр» узыходзіць да лацінскага *circus*. Каб пазбегнуць падобных памылак, апрача агульнай устаноўкі — выяўляць пільнасць у адносінах да сугучных слоў, неабходна развіваць уменне вызначаць той самы корань у розных словах, пры гэтым разумеючы, якія яго відазмяненні (чаргаванні ў яго межах) магчымыя, а якія немагчымыя (напрыклад, ніколі не чаргуюцца *н* і *л*).

**Заданне № 3** з пункту гледжання складанасці было даволі простым. Неабходна было вызначыць часцінамоўную прыналежнасць пэўнага слова і яго сінтаксічную ролю — у прынцыпе, хрэстаматыйная для школьнай практыкі задача, але разам з тым і актуальная, асабліва для не самых моцных вучняў. Для ўдзельнікаў заключнага этапу алімпіяды яе можна разглядаць як замацаванне, шліфоўку адпаведнага навыку, у наяўнасці якога трэба было не сумнявацца. Таму натуральна, што большасць удзельнікаў выканалі заданне паспяхова: 37 % набралі максімальны (4) або блізкі да яго (3,5) бал, сярэдні бал склаў 2,8. Самая распаўсюджаная памылка: частка алімпіяднікаў, вызначаючы сінтаксічную ролю слоў, разглядала як асобны член сказа (акалічнасць) прыназоўнік (***пры** тым будынку*), хаця неабходна было звярнуць увагу на займеннік *тым* (азначэнне).

У **заданні № 4** патрабавалася да фразеалагізмаў з кампанентам *вока* даць тлумачэнне значэння. І тут большасць апынулася на вышыні: сярэдні бал склаў 7,13 (пры максімуме 10). Але ніводзін з удзельнікаў не змог дакладна вызначыць значэнне фразеалагізма *як вокам ахапіць* ‘колькі можна ўбачыць, як далёка бачыць вока’. Тут або ведаеш — або не ведаеш. Правіл на гэтае заданне не існуе. Неабходна адчуванне мовы, пранікненне ў яе сутнасць, карыстанне ёю ў штодзённым жыцці, а больш за ўсё — рэгулярнае чытанне мастацкіх твораў. Таму традыцыйнае ўключэнне ў структуру алімпіяднай работы задання, прысвечанага праверцы на веданне фразеалогіі, цалкам сябе апраўдвае як сродак стымулявання актыўнага чытання беларускай літаратуры.

Пытанні **задання № 5** аказаліся для канкурсантаў нечаканымі, нязвычнымі і, як вынік, нязручнымі з прычыны таго, што абсалютна пэўна, дакладна адказаць на іх дзевяцікласнікам было аб’ектыўна цяжка. Яны ў пераважнай большасці не здагадаліся паставіць у словах націскі, не змаглі назваць слоўнікі, дзе зафіксаваны прадстаўленыя словы і дзе можна іх прымяніць. Гэта звязана найперш з тым, што вучні не маюць пакуль што дастатковага кругагляду па тэме і не могуць сарыентавацца. У выніку толькі адзін удзельнік конкурсу атрымаў 2 балы (з магчымых трох), а сярэдні бал склаў 0,8. Відаць, карысна яшчэ раз пры падрыхтоўцы звярнуцца да практыкі складання слоўнікаў, зрабіць агляд іх тыпаў, прынцыпаў адбору і ўкладання слоў у гэтай вельмі важнай крыніцы сістэматызацыі нашых ведаў.

**Заданне № 6** не мела на мэце нейкай спецыяльнай падрыхтоўкі ўдзельнікаў алімпіяды, а было разлічана на выяўленне іх здольнасці да лагічнага мыслення. Вынікі выканання гэтага задання атрымаліся, з аднаго боку, аптымістычнымі, бо абсалютна ўсе ўдзельнікі бездакорна справіліся з рашэннем сэнсавых прапорцый. Заданні падобнага роду на алімпіядзе могуць дапамагчы вызначыцца вучням з адмысловымі здольнасцямі, што не залежаць ад мэтанакіраванай і часам залішне прагматычнай падрыхтоўкі менавіта да алімпіяды.

На пытанне, змешчанае ў **заданні № 7**, прычым толькі на першую яго частку, што датычылася асобы І. І. Насовіча, змаглі даць правільны адказ толькі два ўдзельнікі алімпіяды (адпаведна слоўнік, створаны славутым беларускім мовазнаўцам, не згадаў ніводзін з канкурсантаў). Мяркуем, такі вынік ні ў якай ступені не азначае таго, што ідэя гэтага задання была неапраўданай, немэтазгоднай. Усё ж такі найлепшых вучняў неабходна знаёміць з постацямі, якія вызначыліся ў навуках беларусазнаўчага цыкла настолькі ярка, як І. І. Насовіч. З’яўленне сярод заданняў алімпіяды падобных пытанняў дае арыенцір настаўнікам для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў. Ды і сёлетні не зусім удалы для ўдзельнікаў алімпіяднага спаборніцтва вопыт таксама павінен прынесці свой канкрэтны плён: многія з іх напэўна зацікавіліся асобай І. І. Насовіча і яго слоўнікам і захочуць даведацца пра іх больш падрабязна.

У **заданні № 8** пераважная большасць школьнікаў не адказала на пытанне «Што паклалі сяляне на магілу Ф. Багушэвічу?». Гэта сведчыць аб недастатковым вывучэнні біяграфіі пісьменніка. Пры гэтым тэксты твораў удзельнікі алімпіяды ведаюць даволі добра. Аб гэтым сведчаць паспяховыя адказы большасці канкурсантаў на пытанні 3 і 4 гэтага задання і правільнае выкананне

большасцю **задання № 10**. Вынікам адноснай паспяховасці выканання задання № 8 стаў сярэдні бал 2,6 пры максімуме 4. Пры гэтым максімальны бал атрымалі тры ўдзельнікі і блізкі да максімальнага (3,5) — яшчэ шэсць вучняў.

Пры выкананні **задання № 9** значная колькасць удзельнікаў алімпіяды палічыла правільным сцвярджэнне «Верш Янкі Купалы “Мужык” стаў песняй-гімнам нацыянальнага адраджэння». Пры добрым веданні тэкстаў гэта, верагодна, сведчыць аб неразуменні сутнасці нацыянальнага адраджэння і слабым веданні гісторыі літаратуры.

Такім чынам, заданні літаратурнай часткі (№№ 8—10), з аднаго боку, дазволілі ўдзельнікам алімпіяды прадэманстраваць моцныя бакі сваёй падрыхтоўкі, у прыватнасці, добрае веданне тэкстаў літаратурных твораў. З другога боку, дапамаглі выявіць шэраг недахопаў, над выпраўленнем якіх трэба папрацаваць як самім вучням, так і іх настаўнікам. Наяўнасць такога «балансу» бачыцца нам як аптымальная адзнака падбору і структуры алімпіядных заданняў. На наш погляд, заданні па літаратуры былі падрыхтаваны адпаведна школьнай праграме па беларускай літаратуры і патрабаванням да ведаў, уменняў і навыкаў вучняў дзявятых класаў.

### Водгук на мастацкі твор: тыповыя памылкі

У IX класе ўдзельнікі алімпіяды пісалі водгук на верш «Не люблю я слова “пакарыцель”...» П. Панчанкі. Пераважная большасць школьнікаў не зусім дакладна вызначыла тэму і асноўную ідэю твора. Філасофскія і экалагічныя аспекты верша засталіся па-за ўвагай удзельнікаў алімпіяды. Адной з тыповых памылак школьнікаў пры аналізе вершаў з’яўляецца няўменне вызначаць аўтарскую пазіцыю. Часта цікавыя назіранні не аргументуюцца або абгрунтоўваюцца агульнымі разважаннямі, далёкімі ад зместу твора. Яшчэ адной з тыповых памылак школьнікаў з’яўляецца неразуменне ролі мастацкіх сродкаў у раскрыцці тэмы і ідэі твора. Пры гэтым большасць удзельнікаў алімпіяды ведаюць мастацкія сродкі шырэй школьнай праграмы і з поспехам знаходзяць іх у творы. Адной з грубых памылак у водгуку часта бывае несуразмернасць кампазіцыйных частак творчай працы: найчасцей расцягнуты ўступ, які характарызуецца залішняй пафаснасцю. У дзявятым класе, на жаль, частымі бываюць моўныя штампы і выкарыстанне русізмаў. Школьнікі выказваюць цікавыя назіранні, імкнуцца праявіць творчы падыход, пры гэтым не заўсёды ўмеюць асэнсоўваць мастацкі тэкст у кантэксце творчасці пісьменніка. Амаль адсутнічаюць паралелі з творамі іншых аўтараў, як і гісторыка-культурныя параўнанні.

## X клас

### Комплексная работа

Комплексная работа ў X класе змяшчала заданні па розных раздзелах лінгвістыкі (арфаграфія, фразеалогія, лексікалогія, марфалогія, сінтаксіс, гісторыя мовазнаўства), а таксама па гісторыі і (у нязначнай ступені) тэорыі літаратуры. Адсутнічалі заданні па фанетыцы і арфаэпіі, марфеміцы і словаўтварэнні, стылістыцы і культуры маўлення, а таксама заданні на супастаўляльны аналіз матэрыялу беларускай і рускай моў, пераклад тэксту.

**Заданне 1.** Даволі складанае правіла беларускага правапісу (напісанне літар *э, е* ў запазычаных словах) цалкам грунтуецца на літаратурным вымаўленні, таму напісанне адпаведных слоў вызначаецца пераважна па слоўніку. Удзельнікі ўвогуле добра справіліся з заданнем, паколькі былі прапанаваны дастаткова частотныя і вядомыя ім словы. Узровень выканання задання абумоўлены ступенню валодання вучнямі вусным і пісьмовым беларускім маўленнем.

**Заданне 2.** Заданне разлічана, хутчэй, на інтуітыўнае адчуванне вучнямі вытокаў некаторых запазычаных слоў, чым на дакладнае веданне этымалогіі лацінізмаў, якая стварае пэўныя праблемы нават для спецыялістаў, тым больш што многія словы траплялі ў беларускую праз пасрэдніцтва іншых моў. Адпаведна, заданне давала падставы для фантастычнага збліжэння слоў і каранёў абсалютна рознага паходжання на прынцыпах «народнай» этымалогіі (адвольнага гукавога збліжэння тыпу *nauta* — *нафта*). Некаторыя ж лексемы, прапанаваныя ў адказах, патрабавалі спецыяльных этымалагічных даследаванняў для пацвярджэння ці абвяржэння іх лацінскіх этымонаў.

**Заданне 3.** Сінтэтычнае заданне па марфалогіі і сінтаксісе мае на мэце праверку навыкаў

марфалагічнага і сінтаксічнага разбору, размежавання аманімічных граматычных канструкцый і ў цэлым выглядае апраўданым і даволі карысным. Разам з тым трэба адзначыць, што ніводзін з сучасных беларускіх слоўнікаў літаратурнай мовы не падае лексемы *адтаго*.

**Заданне 4.** Веданне семантыкі фразеалагізмаў — неабходная ўмова культуры вуснага і пісьмовага маўлення, багацця і разнастайнасці вобразных сродкаў ва ўласнай камунікатыўнай і творчай дзейнасці. Заданне разлічана не толькі на выяўленне актыўнага фразеалагічнага запасу школьніка, але і на праверку ўмення лагічна, несупярэчліва фармуляваць семантычныя дэфініцыі. У ходзе выканання нярэдка вучні надзялялі фразеалагічныя адзінкі прыдуманымі, неузуальнымі значэннямі, адвольна выведзенымі з семантыкі асобных кампанентаў.

**Заданне 5.** Правільнае вызначэнне граматычнага роду назоўнікаў прадугледжвае ў першую чаргу веданне семантыкі лексемы і актыўнае выкарыстанне яе ва ўласнай моўнай практыцы. Значна дапамагчы магло таксама валоданне парадыгмай словазмянення канкрэтнага назоўніка. Вучні ў асноўным добра справіліся з заданнем, памылкі назіраліся галоўным чынам у выпадку несупадзення роду ў беларускай і рускай мовах *(сажань)*, а таксама ў кніжным архаізме *скрыжаль*.

**Заданне 6.** Заданне з выкарыстаннем сэнсавых прапорцый арыентуе на выяўленне элементаў логіка-матэматычнага мыслення і ўмення бачыць сіметрычныя адпаведнасці ў моўным матэрыяле, аналізаваць «семантычныя множнікі» слова. Вучні ў асноўным лёгка справіліся з рашэннем. Магчыма, заданне варта было крыху ўскладніць, павялічыўшы колькасць членаў прапорцыі (у тым ліку невядомых) у кожнай частцы роўнасці.

**Заданне 7.** Заданне па гісторыі філалагічнай навукі ўяўляецца вельмі патрэбным і карысным у пазнавальным і выхаваўчым плане, яно было арыентавана на «звышпраграмныя» веды школьнікаў. Менавіта гэтае заданне выклікала найбольшыя цяжкасці. Дастаткова сказаць, што з ім не справіўся ў поўным аб'ёме ніводзін (!) удзельнік. Відавочна, у школьнай праграме нават не згадваецца імя вядомага беларускага асветніка, а 190-гадовы юбілей П. М. Шпілеўскага, які прыпадае на бягучы год, не падаецца педагогам дастаткова важкай падставай для ўпамінання вучонага хоць бы ў аглядавых тэмах.

**Заданне 8.** Заданні па беларускай літаратуры мелі ў значнай ступені «тэставы» характар і, як правіла, патрабавалі канкрэтнага ведання праграмнага матэрыялу і аднязначнага адказу. Адпаведна яны былі дастаткова лёгкімі па форме (але не па змесце!) для выканання і прыдатнымі для хуткай праверкі. Пры выкананні восьмага задання асабліва засмуціла слабае веданне многімі школьнікамі класічнага тэксту «Пінскай шляхты».

**Заданне 9.** Прапанаваны ў гэтым заданні тэст поўнасцю адпавядае патрабаванням школьнай праграмы і ў цэлым быў выкананы на дастаткова добрым узроўні. Думаецца, пытанні можна было больш разнастаіць у плане павелічэння аб'ёму матэрыялу па тэорыі літаратуры.

**Заданне 10.** Заданне дасціпнае і цікавае, дастаткова пасільнае для вучняў. Праўда, адразу ўзнікае пытанне пра мастацкія вартасці такога «гібрыда» і рэальнасць яго бытавання ў літаратурным працэсе. Увогуле вучні дастаткова добра справіліся з гэтым заданнем.

### Водгук на мастацкі твор

Гэты від конкурсу прызначаны найперш для выяўлення ступені валодання вучнямі пісьмовым маўленнем і яго нормамі, а таксама навыкамі літаратуразнаўчага і моўнастылістычнага аналізу мастацкіх твораў. Істотнае значэнне мае асобасны, творчы падыход да напісання водгуку, літаратурная дасведчанасць і агульная эрудыцыя аўтара. Заўсёды звяртае на сябе ўвагу і высока цэніцца арыгінальнасць думак і выкладу, наяўнасць пэўных элементаў пісьменніцкага майстэрства. Істотна паўплываць на ацэнку могуць адсутнасць належнага аналізу мастацкіх сродкаў і разнатыпныя памылкі.

Для водгуку дзесяцікласнікам быў прапанаваны твор Алеся Разанава — вершаказ «Гліна». Вершаказ — адна з наватарскіх, уласна аўтарскіх жанравых формаў, уведзеных А. Разанавым у беларускую паэзію. Насычанасць гукавымі метафарамі, паэтычнымі этымалагізмамі ў творах гэтага жанру служыць для выяўлення філасофскіх, анталагічных праблем, такіх, як сувязь спадчыны мінулага і сучаснасці, гістарычная памяць, асоба і час, жыццё і смерць, экзістэнцыяльны сэнс рэчаў і інш. Вобраз гліны як глабальная метафара творчасці ўвогуле і матэрыялу для творцы ў прыватнасці неаднаразова сустракаецца ў тэкстах А. Разанава.

У прапанаваным канкрэтным творы асноўны сэнс, тэма, праблема і аўтарская пазіцыя найбольш канцэнтравана выяўлены ў выказваннях: «...Сам ён [чалавек] з гліны, і да канца сваіх дзён ён лепіць з сябе такі твор, які адпавядае яго ўяўленням, задумам і ўчынкам...»; «Гліна — нігіль, нішто, але ў боскіх руках яна становіцца геніяльнай». У большасці ўдзельнікаў алімпіяды выяўленне тэматыкі і праблематыкі асаблівых цяжкасцей не выклікала, хоць дамінантны матыў творчасці ўбачылі ў вершаказе далёка не ўсе. Яшчэ больш складана было абгрунтаваць уласнае прачытанне твора наяўным чытацкім вопытам. Часта адсутнічалі спасылкі на сусветную літаратуру, змястоўныя паралелі з іншымі творамі. Згадкі пра беларускія творы таксама былі нешматлікія і сэнсава бедныя, часам выглядалі выпадковымі і нават штучна прывязанымі да кантэксту. Як відаць, мысленне літаратурнымі асацыяцыямі сучасным школьнікам не вельмі ўласцівае, не надта багаты і іх чытацкі досвед.

Асобную праблему складае выяўленне ролі вобразных сродкаў. Калі вучні і бачаць іх, то нярэдка ўзнікаюць цяжкасці з дакладнай ідэнтыфікацыяй (бракуе ведаў па тэорыі літаратуры). Часта аналіз мастацкіх сродкаў нібы адасабляецца ад астатняга тэксту водгуку, арганічна не звязаны з ім, выступаючы ў нейкай ступені чужароднай устаўкай. Паказаць, як мастацка-вобразнае майстэрства пісьменніка «працуе» на змест твора, выяўленне яго праблематыкі — адна з найбольш складаных задач пры напісанні водгуку. Тое ж можна сказаць і пра ролю кампазіцыі.

Што да пісьменнасці, то яна ў абсалютнай большасці водгукаў была на дастаткова прымальным узроўні, колькасна вылучаліся пунктуацыйныя памылкі ў складаных і простых ускладненых сказах, а таксама некаторыя моўныя недахопы (пераважна русізмы і неапраўданыя паўторы слоў).

Прапанаваны для водгуку твор даваў магчымасць вучням выявіць уласную грамадзянскую пазіцыю, зрабіць наглядную праекцыю ідэй паэта на сучаснае жыццё, паразважаць пра сённяшнюю актуальнасць спрадвечных ідэалаў і памкненняў найлепшых прадстаўнікоў гісторыі чалавецтва.

### Вуснае выказванне

Вуснае выказванне на адну з прапанаваных у білеце дзвюх тэм мела на мэце выявіць уменне вучняў правільна разумець і з належнай паўнатой раскрываць канкрэтную грамадска значную ці філалагічную тэму, лагічна і паслядоўна выказваць свае думкі, захоўваць нормы беларускага вуснага літаратурнага маўлення, пераканальна ўздзейнічаць на аўдыторыю. Вучні ў пераважнай большасці паспяхова справіліся з адпаведнымі задачамі. Найбольш удалымі былі выказванні, у якіх прысутнічаў ярка выражаны асабісты пачатак, пазітыўны настрой, элементы гумару і нават самаіроніі, а таксама дыялагічны кампанент, імправізацыя, артыстызм.

У асобных выступленнях бракавала эрудыцыі, свабоды думкі і свабоды яе рэалізацыі моўнымі сродкамі. Не лепшыя ўражанні пакідала «завучанасць» традыцыйных, стандартных тэм (Беларусь, маці, мова, гісторыя), што пацягнула за сабой некаторыя трафарэтныя палажэнні, «зацёртыя» факты, прыклады. У маўленні асобных удзельнікаў прысутнічала значная колькасць ярка выражаных русізмаў, што можна лічыць асноўным недахопам маўленчай культуры прамоўцаў.

Думаецца, пры падрыхтоўцы выказвання апраўданай з'яўляецца ўстаноўка на тое, каб хоць крыху нечым здзівіць слухачоў (журы), унесці элемент незвычайнасці і нават святочнасці ў сваё паведамленне, пастарацца быць самастойным і арыгінальным, выявіць акрэсленую жыццёвую пазіцыю. Безумоўна, па-ранейшаму першачаргова важнымі застаюцца ўсім вядомыя, агульнапрынятыя патрабаванні да гэтага віду конкурсу, адлюстраваныя ў зацверджаных крытэрыях яго ацэнкі.